кожнай галіне прафесійнай дзейнасці. Нягледзячы на адрозненні навукова-даследчых падыходаў, у іх ёсць шмат аднолькавага, тыповага, што і знаходзіць адлюстраванне ў абагульняючых працах па метадалогіі і творчай, у тым ліку і навуковай, дзейнасці. Авалоданне трывалымі ведамі на першай ступені адукацыі (неабходная агульнаадукацыйная і прафесійная інфармацыя+веды аб яе атрыманні і аднаўленні) дазваляе перайсці да другой ступені. Вось тут навучальны працэс павінен пераўтварацца ў сапраўдны навуковы пошук, у якім сумесна дзейнічаюць навучэнец і выкладчык. Задача першага заключаецца ў авалоданні практычнымі навыкамі навукоўца, даследчыка. Гэта магчыма ажыццявіць толькі ў тым выпадку, калі выкладчык сам будзе дэманстраваць узоры навуковага пошуку.

На другой ступені навучання ў ВНУ патрэбна ўвядзенне такіх формаў заняткаў, якія б дазволілі арганізаваць сумесную дзейнасць, узаемадзеянне выкладчыка і студэнта ў разглядзе і вырашэнні найбольш актуальных навуковых праблем, якія павінны вызначацца па кожнай дысцыпліне асобна. Здаецца, што ў гэтым сэнсе можна перабудаваць змест і традыцыйныя формы навучальнага працэсу, надаўшы ім новую сутнасць. З гэтай нагоды выкладчык у праблемнай лекцыі, напрыклад, павінен расказваць не аб тым, што трэба ведаць студэнту, і нават не аб тым, што трэба рабіць гэтаму студэнту, даследуючы вывучаемую з'яву. Лекцыя можа быць пабудавана зусім інакш, у ей выкладчык-навуковец як бы гаворыць студэнту: «Я не кажу табе, што ты павінен разглядаць гэту ці падобную праблему менавіта так, але я ведаю, як яе разглядаюць іншыя навукоўцы, і з гэтай нагоды я маю свой падыход, таму я разглядаю гэту праблему менавіта такім чынам». Такое стаўленне да праблемы ўводзіць навучэнца ў творчую лабараторыю выкладчыка, ен становіцца саўдзельнікам свайго настаўніка-навукоўца. Вядома, што толькі ў гэтых выпадках магчыма засваенне тых неабходных кожнаму творчаму працаўніку так званых эмпірычных эўрыстык, набору эмпірычных правіл дзейнасці з вывучаемым прадметам, якія не ўваходзяць у агульныя лагічна афармленыя правілы, але без якіх немагчыма здзейсніць любы творчы працэс.

Такім жа чынам можна будаваць і семінарскія ці практычныя заняткі, дзе выкладчык і студэнты мяняюцца ролямі, але ж працягваюць супрацоўніцтва.

Мабыць, менавіта ў гэтым сэнсе мы маем права гаварыць аб педагогіцы супрацоўніцтва, якая ў вышэйшай школе павінна знайсці трывалае ўвасабленне. І перш за ўсё - у пераўтварэнні навучання ў творчы, навукова-даследчы працэс.

Самушчык Т.У.,
аспірантка

## РОЛЯ ФІЛАСОФСКАЙ АДУКАЦЫІ Ў КОМПЛЕКСНЫМ ВЫВУЧЭННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ І СУСВЕТНАЙ КУЛЬТУРЫ

Комплекснае вывучэнне нацыянальнай і сусветнай культуры немагчыма сёння без удасканалення гуманітарнай адукацыі, і перш за ўсё філасофскай, бо вывучэнне філасофіі, яе гісторыі аказваецца сапраўднай школай духоўнага самаўзбагачэння, практыкумам духоўнай самасвядомасці. Далучэнне да філасофскай спадчыны прадугледжвае не толькі фарміраванне светапогляду асобы, павышэнне яе эрудыцыі, але і асабістае духоўна-практычнае далучэнне да філасофскага свету. Філасофія выступае ў якасці механізма адаптацыі культуры да ўсіх змен, у рамках якога мы можам супаставіць усе формы асваення рэчаіснасці чалавекам. Філасофія як інтэгратар культуры не можа абмяжоўваць сябе нейкім адным спосабам асваення рэчаіснасці, нейкай адной формай грамадскай свядомасці. Таму і праграма выкладання філасофіі павінна быць своеасаблівым зрэзам сацыяльна арганізаванай рэфлексіі, у якую ўваходзяць дыялектыка (як вучэнне аб сукупнасці прынцыпаў і нормаў, на падставе якіх чалавек адлюстроўвае навакольны свет і будуе яго карціну), аксіялогія (як вучэнне аб асновах выбару і каштоўнасных арыентацыях) і вучэнне аб свядомасці ( як абгрунтаванне магчымасцей камунікацыі).

Разглядаючы праблему ўдасканалення філасофскай адукацыі моладзі, зазначым, што працэс выкладання філасофскіх дысцыплін сёння перажывае час вызвалення ад вынікаў дзеяння механізма тармажэння ў выглядзе элементаў дагматызму, схаластыкі, адарванага ад жыцця тэарэтызавання, ілжывых стэрэатыпаў і інш. Гэта патрабуе ўдасканалення структуры і метадаў выкладання філасофскіх дысцыплін, пераарыентацыі філасофскай адукацыі. Цэнтрам увагі грамадазнаўства павінен стаць чалавек з яго рэальнымі жыццёвымі праблемамі, патрабаваннямі і інтарэсамі.

Важным сродкам і неабходнай умовай у вырашэнні праблем, звязаных з філасофскай адукацыяй, з'яўляецца выкладанне філасофіі з улікам профілю ВНУ. Тут важныя два моманты: па-першае, выкладанне філасофіі неабходна наблізіць да зместу прафілюючых дысцыплін ВНУ; па-другое, напоўніць філасофскім зместам выкладанне некаторых прыродазнаўчых і прыродазнаўча-тэхнічных дысцыплін, бо толькі філасофская адукацыя дае магчымасць пераадолець тэхнакратычнае і вузкапрафесійнае мысленне, выхоўвае духоўна багатую асобу,

арыентаваную на агульначалавечыя каштоўнасці, новы ўзровень адукацыі і культуры, інфармаванасці і кругагляду.

У цэнтры філасофскай адукацыі - фарміраванне свядомасці і самасвядомасці сучаснага маладога пакалення. Сення актуальнай і практычна значымай становіцца праблема пошуку сацыяльна-філасофскіх рэгулятываў, якія вызначаюць стратэгію выхавання светапогляднай культуры асобы ў выкладанні філасофіі. Акрамя гэтага, асаблівае значэнне набывае разуменне спецыфікі каштоўнасных арыентацый моладзі, таму што менавіта яны ляжаць у аснове свядомага выбару мэты і сродкаў дзейнасці асобы. Падкрэслім, што абвастрэнне эканамічнай і сацыяльнай сітуацыі ў грамадстве, а разам з гэтым і існуючых маладзёжных праблем, карэнныя змены ў патрабаваннях сучаснай моладзі, ўсёй сістэме матывацыі, пераарыентацыя моладзі з духоўных на прагматычныя каштоўнасці закранаюць у значнай ступені развіццё індывідуальнасці асобы і разам з ею каштоўнасныя арыентацыі. Апошнія даюць інфармацыю аб якасці адносін асобы да навакольнага свету, адлюстроўваюць узровень патрабаванняў рэалізацыі асобы, які з'яўляецца выяўленнем яе індывідуальнасці.

Такім чынам, комплекснае вывучэнне нацыянальнай і сусветнай культуры немагчыма сёння без філасофіі, яна звяртаецца да гуманістычных традыцый мінулага, выяўляючы новы сэнс гуманізму, у аснове якога ляжаць ідэалы ненасілля, міру і агульначалавечых каштоўнасцей.

Ігнатовіч П.Р.,
дацэнт

## МЕСЦА САЦЫЯЛАГІЧНЫХ І КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ ВЕДАЎ У ГУМАНІТАРНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТАЎ

У апошнія гады ў Рэспубліцы Беларусь вядзецца грунтоўная работа па ўдасканаленню сістэмы адукацыі, уключаючы вышэйшую школу. У сувязі з новымі ўмовамі фармулююцца і новыя падыходы, накіраваныя на набліжэнне падрыхтоўкі спецыялістаў да еўрапейскіх і сусветных стандартаў. Сярод такіх падыходаў значнае месца займае гуманітарная падрыхтоўка студэнтаў. Удумлівая яе арганізацыя спрыяе фарміраванню маладога спецыяліста, у якога павінны быць шырокі кругагляд, творчае мысленне, такі спецыяліст умее адэкватна ацэньваць сітуацыю і прымаць найбольш мэтанакіраванае рашэнне праблемы.

У сфармуляванай навукоўцамі і Міністэрствам адукацыі канцэпцыі гуманітарнай падрыхтоўкі пэўнае месца займае культуралагічная і сацыялагічная адукацыя. Асаблівае значэнне гэты падыход мае для студэнтаў універсітэта культуры. Выпускнікі універсітэта будуць мець адносіны са складанай сістэмай, важнейшым кампанентам якой з'яўляецца чалавек з яго разнастайнымі грамадскімі сувязямі і культурай як сацыяльнай з'явай.

Рашэнню задачы гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў у Беларускім універсітэце культуры спрыяе распрацоўваемая тут сістэма. Пэўнае месца ў гэтай сістэме займае і кафедра сацыялогіі і культуразнаўства, якая існуе з лютага 1993 года. Перад ей стаяць задачы забеспячэння культуралагічнай, сацыялагічнай, эканамічнай і юрыдычнай падрыхтоўкі студэнтаў і аспірантаў. Гэта сацыяльны заказ, які сфармуляваны заказчыкам (рэктарам, дэканатамі) і замацаваны ў навучальных планах. Для іх пленнага выканання патрэбна мець пэўнае кадравае, навуковае, навукова-метадычнае забеспячэнне. Зараз вядзецца мэтанакіраваны пошук шляхоў распрацоўкі тэарэтычных асноў выкладаемых прадметаў. Супрацоўнікі кафедры падтрымліваюць сувязі з іншымі кафедрамі універсітэта, ВНУ і навуковымі цэнтрамі. У якасці сумяшчальнікаў на кафедры працуюць дырэктар Беларускага інстытута інфармацыі і прагнозу прафесар Антановіч І.І., загадчык сектара сацыялогіі культуры Інстытута сацыялогіі АН РБ прафесар Дарашэвіч Э.К., галоўны спецыяліст Інстытута праблем культуры прафесар Грабеннікаў Р.В. і інш. Падтрымліваюцца сувязі і з замежнымі краінамі. У мінулым годзе, напрыклад, двойчы пабывала ў нашым універсітэце, чытала лекцыі, прымала ўдзел у абмеркаванні навуковых і навукова-метадычных праблем загадчыца кафедры гісторыі культуры Шленскага універсітэта ў Катавіцах прафесар Ева Касоўска.

Вядзецца значная работа па метадычнаму забеспячэнню навучальнага працэсу. Па ўсіх выкладаемых прадметах распрацаваны праграмы, іншая навукова-метадычная дакументацыя.

Сведчаннем увагі да культуралагічнай і сацыялагічнай падрыхтоўкі з'яўляецца абмеркаванне пытанняў па гэтай праблеме на розных узроўнях. Напрыклад, прадметам зацікаўленай размовы на пасяджэнні Рады універсітэта ў кастрычніку мінулага года было пытанне аб рабоце кафедры па культуралагічнай падрыхтоўцы студэнтаў і аспірантаў. У прынятай пастанове намечана шырокая праграма па гэтаму пытанню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ